только тогда, когда они изъяты в соответствии с требованиями действующих процессуальных норм.

Такие предметы или вещества должны изыматься и осматриваться в присутствии понятых, фотографироваться, описываться в протоколе осмотра места пожара или в протоколе изъятия. На схеме или чертеже указывается, в каком месте были обнаружены или изъяты вещественные доказательства.

Особое внимание при осмотре очага пожара должно быть уделено поиску средств поджога или их остатков и следов: самодельных фитилей, бикфордовых шнуров, горючих жидкостей, зажигательных приспособлений и т. п.

Если выдвигается предположение о поджоге с применением легковоспламеняющихся и горючих жидкостей (ЛВЖ и ГЖ), необходимо искать остатки такой жидкости, тару из-под нее, следы ее использования для поджога.

Особенности обнаружения признаков поджога проявляются при проведении осмотра места происшествия как элемент тактики следственного осмотра. Само место происшествия (пожарище), характер огня диктуют особенности выявления признаков поджога, вещественных доказательств. При расследовании дел о поджогах особое значение имеет его квалифицированное проведение. Важно также скорейшее прибытие на пожарище следователя и его непосредственное наблюдение за развитием событий. Методы и последовательность осмотра зависят от конкретных условий и характера пожара. Задачами этого следственного действия являются: изучение и фиксация обстановки места пожара, обнаружение очага возгорания; отыскание и фиксация признаков поджога или преступного нарушения противопожарных правил, признаков, указывающих на виновное лицо; отыскание следов маскируемого преступления и получение исходных данных для выдвижения версий. Уже в ходе осмотра места происшествия удается выявить и даже раскрыть поджог.

## ЗНАЧЭННЕ ДЛЯ ПРАВАВОЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ СТАТУТА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА 1529 ГОДА

**С. А. Варанкевіч**

29 верасня 2002 года споўнілася 473 гады, як на Віленскім сойме 1528–1529 гадоў быў уведзены ў дзеянне ці не самы значны ў гісторыі Беларусі прававы акт – Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 года.

Першая палова XVI стагоддзя – час несупынных войнаў з Маскоўскім царствам (1500–1503 гг., 1506–1508 гг., 1512–1522 гг.), час рэлігійнага супрацьстаяння між каталіцкай і праваслаўнай шляхтай, час, калі само існаванне дзяржавы пастаўлена пад пагрозу. Беларуска-літоўскай дзяржаве неабходны прававы акт, які аб'явіць роўнасць паміж вернікамі заходняга і ўсходняга абрадаў, гэтым самым знішчыўшы галоўную падставу для варажнечы, дакумент, які будзе валодаць вышэйшай юрыдычнай сілай, які уніфікуе і сістэматызуе існуючае заканадаўства. Так быў створаны Першы Статут Вялікага княства Літоўскага, які апярэдзіў па сваёй юрыдычнай распрацаванасці ўсе існуючыя ў Еўропе прававыя акты.

Статут 1529 года стаў першым у сярэднявечнай Еўропе сістэматызаваным зводам законаў [2, с. 76]. Ён быў абсалютна арыгінальным творам прававой думкі. Да гэтага нічога падобнага нідзе не стваралася. Напрыклад, спосаб размяшчэння нормаў права, як адзначае прафесар И. А. Юхо, быў цалкам мясцовай распрацоўкай, а не калькай з рымскага права [2, с. 76].

Да гэтага ні адна еўрапейская дзяржава не валодала прававым актам такой значнасці, выдадзенай на мове насельніцтва, а не на лаціне. Мова Статута (старабеларуская мова) была зразумелая не толькі адукаваным феадалам, але і простаму народу. Людзі паспалітыя маглі разумець сэнс слоў двух самых галоўных законаў у сваім жыцці: Закона Божага, які надрукаваў Скарына, і Закона свецкага (гэта быў Першы Статут), у распрацоўцы якога, як мяркуецца, прымаў удзел той жа Скарына [2, с. 75].

Ні адзін прававы акт XVI стагоддзя так глыбока не ўспрыняў каштоўнасці Рэнесансу, як гэта зрабіў Статут Вялікага княства Літоўскага [3]. Уплыў ідэй грамадскага пагаднення і дзяржаўнага суверэнітэту на Статут відавочны. Погляды, што ўлада манарха трымаецца на добраахвотным падпарадкаванні, а сам манарх абавязаны забяспечваць згоду ў грамадстве, толькі атрымалі вядомасць, а яны ўжо знайшлі нагэтулькі добрую глебу ў Вялікім княстве Літоўскім, што нават былі пісьмова замацаваныя ў прадмове да Трэцяга Статута падканцлерам ВКЛ Сапегам. І гэта адбываецца ў той час, калі ў суседкі-Расіі манарх абагаўляецца і лічыцца намеснікам Бога на зямлі!

Ужо ў пачатку XVI стагоддзя нашыя продкі заклалі ў Статут галоўны прынцып прававой дзяржавы: «…вси подданые наши, так вбогие, яко и богатые… або стану бли бы, ровно а адностайным, тым писаным правом мають сужоны быти» [1, с. 34]. Канешне, тут маецца на

ўвазе роўнасць паміж людзьмі аднаго саслоўя (стану), бо гэта сярэднявечча са сваімі несправядлівымі, як нам здаецца, але цалкам натуральнымі законамі.

З мэтай аб'ектыўнасці і справядлівасці суда ў артыкуле першым VI раздзела Статута змешчаны прынцып прыярытэту пісанага права: «Абы судили правом писаным; а естли бы судил иначей маеть каран быти» [1, с. 69].

Першы Статут уяўляе каштоўнасць і для сённяшняй Беларусі. І не толькі ў якасці гістарычнага помніка права, але і як матэрыял для даследавання старабеларускай мовы, яе лексікі і сінтаксісу. Акрамя таго, Статут 1529 года закладзенымі ў сабе ідэямі паказвае неразрыўную гістарычную сувязь паміж Беларуссю і астатняй Еўропай, служыць напамінкам нашай прыналежнасці да еўрапейскай цывілізацыі.

Такім чынам, з прыняццем Статута 1529 года Вялікае княства Літоўскае зрабіла велізарны крок у развіцці свайго права. Статут прадвызначыў шлях далейшага развіцця права краіны, паўплываў на развіццё агульнаеўрапейскага права [2, с. 67], выхаваў цэлую плеяду таленавітых праўнікаў (юрыстаў), стаў галоўнай крыніцай Другога Статута (1566) і Статута Вялікага княства Літоўскага 1588 года – дакумента, які многія навукоўцы называюць не інакш, як першай канстытуцыяй у свеце.

**Літаратура**

1. Статут Великого княжества Литовского 1529 года. Мн., 1960.
2. *Юхо І. А.* Крыніцы беларуска-літоўскага права. Мн., 1991.
3. Інтэрнэт-адрас: http://tbm.org.by/ns/no40/statut.html.

## ФИКТИВНОСТЬ В СЕМЕЙНО-ПРАВОВОЙ СФЕРЕ

**О. П. Гладченко**

Фиктивность, безусловно, можно назвать негативным явлением в правовой сфере. В той или иной мере она распространена во всех отраслях права, но больше всего – в цивилистике, а именно: в гражданском, трудовом, семейном праве. Чаще всего – в образе фиктивной сделки и фиктивного договора. Однако в семейном праве фиктивность гораздо многовариантнее, чем предусмотрено действующим законодательством в ст. 45 КоБС Республики Беларусь.

Фиктивным является такое действие или отношение, которое внешне – по правовой форме – отвечает требованиям закона, а по цели и содержанию не соответствует ему вплоть до противоположности.